# Дзеяслоў
# (Verbum)

## Граматычныя катэгорыі

1. Час:
• praesens (*praes*.) — цяперашні;
• imperfectum (*imperf*.) — прошлы незакончанага трывання;
• perfectum (*perf*.) — прошлы закончанага трывання;
• plusquamperfectum (*pqperf*.) — запрошлы (даўномінулы, перадмінулы);
• futurūm I (*fut. I*) — будучы;
• futurūm II (*fut. II*) — перадбудучы.
2. Лад:
• indicatīvus (*ind*.) — абвесны;
• imperatīvus (*imperat*.) — загадны;
• conjunctīvus (*conj*.) — умоўны;
3. Стан:
• actīvum (*act*.) — незалежны;
• passīvum (*pass*.) — залежны.
4. Асоба: 1, 2, 3-я.
5. Лік:
• singulāris (*sg*.) — адзіночны;
• plurālis (*pl*.) — множны.
6. Спражение: 1, 2, 3, 4-е.

Дзеясловы размяркоўваюцца па спражэннях у залежнасці ад гуку, на які заканчваецца аснова infectum:

| Спражэнне | Канцавы гук асновы |
|---|---|
| I | **ā** |
| II | **ē** |
| IIIa | **зычны, u** |
| IIIб | **ĭ** |
| IV | **ī** |

## Асноўныя формы дзеяслова

Дзеяслоў мае чатыры асноўныя формы:

| Асноўная форма | I спр. | II спр. | III спр. | IV спр. |
|---|---|---|---|---|
| **1. Praesens indicatīvi actīvi, 1 *sg*.** | **laud-o** | **doce-o** | **scrib-o** | **audi-o** |
| 2. Perfectum indicatīvi actīvi, 1 *sg*. | laudāv-i | docu-i | scrips-i | audīv-i |
| 3. Supīnum | laudāt-um | doct-um | script-um | audīt-um |
| **4. Infinitīvus praesentis actīvi** | **laudā-re** | **docē-re** | **scrib-ĕre** | **audī-re** |
| Пераклад | *хваліць* | *вучыць* | *пісаць* | *слухаць* |

З а ў в а г а. Замест чацвёртай асноўнай формы ў слоўніку звычайна ўказваецца нумар спражэння: laudo, 1 і г. д.

**Вызначэнне асновы infectum**

Аснова infectum вызначаецца па 1-й асноўнай форме. У I спражэнні канчатак -**o** замяняецца на **ā**, у астатніх спражэннях канчатак -**o** адкідваецца:

| Дзеяслоў | laud-o, 1 *хваліць* | doce-o, 2 *вучыць* | scrib-o, 3а *пісаць* | stru-o, 3а *будаваць* | faci-o, 3б *рабіць* | audi-o, 4 *слухаць* |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Аснова infectum | laudā- | docē- | scrib- | stru- | facĭ- | audī- |

## Infinitivus praesentis activi

Infinitīvus praesentis actīvi (інфінітыў цяперашняга часу незалежнага стану; 4-я асноўная форма) утвараецца ад асновы infectum з дапамогай суфіксаў -**re**/-**ĕre**:

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Аснова infectum** | + | **-re**<br>**-ĕre** | **(I, II, IV спр.)**<br>**(III спр.)** |

З а ў в а г а. У IIIб спражэнні канцавы галосны асновы **ĭ** выпадае.

| Дзеяслоў | laud-o, 1 *хваліць* | doce-o, 2 *вучыць* | audi-o, 4 *слухаць* | scrib-o, 3а *пісаць* | stru-o, 3а *будаваць* | faci-o, 3б *рабіць* |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Аснова infectum | laudā- | docē- | audī- | scrib- | stru- | facĭ- |
| *Inf. praes. act.* | laudā-**re** | docē-**re** | audī-**re** | scrib-**ĕre** | stru-**ĕre** | fac-**ĕre** |

## Praesens indicativi activi

Praesens indicatīvi actīvi (цяперашні час абвеснага ладу незалежнага стану) утвараецца з дапамогай асабовых канчаткаў actīvi (незалежнага стану).

**Асабовыя канчаткі actīvi**

| Асоба | Singulāris | Plurālis |
|---|---|---|
| 1-е | **o** | **mus** |
| 2-е | **s** | **tis** |
| 3-е | **t** | **nt** |

**Дзеясловы I, II, IIIб, IV спражэнняў**

Praesens indicatīvi actīvi дзеясловаў I, II, IIIб, IV спражэнняў утвараецца ад асновы infectum з дапамогай асабовых канчаткаў actīvi:

| | | |
|---|---|---|
| **Аснова infectum** | + | **асабовыя канчаткі actīvi** |

З а ў в а г і.

1. У I спражэнні ў 1 *sg*. -**ā** у канцы асновы выпадае.

2. У IIIб, IV спражэннях у 3 *pl.* паміж асновай і канчаткам з’яўляецца злучальны галосны -**u**-.

| Асоба | laud-o, 1 (laudā-) *хваліць* | doce-o, 2 (docē-) *вучыць* | faci-o, 3б (facĭ-) *рабіць* | audi-o, 4 (audī-) *слухаць* |
|---|---|---|---|---|
| | Singulāris | | | |
| 1-я | laud-**o** | doce-**o** | faci-**o** | audi-**o** |
| 2-я | lauda-**s** | doce-**s** | faci-**s** | audi-**s** |
| 3-я | lauda-**t** | doce-**t** | faci-**t** | audi-**t** |

| Plurālis | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1-я | laudā-**mus** | docē-**mus** | facĭ-**mus** | audī-**mus** |
| 2-я | laudā-**tis** | docē-**tis** | facĭ-**tis** | audī-**tis** |
| 3-я | lauda-**nt** | doce-**nt** | faci-**u**-**nt** | audi-**u**-**nt** |

**Дзеясловы IIIa спражэння**

Praesens indicatīvi actīvi дзеясловаў IIIa спражэння ўтвараецца ад асновы infectum з дапамогай злучальных галосных і асабовых канчаткаў actīvi:

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Аснова infectum** | + | **злучальныя галосныя** | + | **асабовыя канчаткі actīvi** |

Ужываюцца наступныя злучальныя галосныя:

**-ĭ-** перад **m**, **s**, **t**

**-u-** перад **n**

| Асоба | scrib-o, 3a (scrib-) *пісаць* | stru-o, 3a (stru-) *будаваць* |
|---|---|---|
| | Singulāris | |
| 1-я | scrib-**o** | stru-**o** |
| 2-я | scrib-**i**-**s** | stru-**i**-**s** |
| 3-я | scrib-**i**-**t** | stru-**i**-**t** |
| Plurālis | | |
| 1-я | scrib-**ĭ**-**mus** | stru-**ĭ**-**mus** |
| 2-я | scrib-**ĭ**-**tis** | stru-**ĭ**-**tis** |
| 3-я | scrib-**u**-**nt** | stru-**u**-**nt** |